Падтрымай "Вясну" на PATREON

Графіціста Алега Ларычава і Ганну Новік асудзілі да штрафаў дапоўнена

06.06.2017 **Тэгі**: затрыманні



Алег Ларычаў і Ганна Новік у судзе. Фота з Instagram Джона Сільвера.

Куратар стрыт-арт-праекту Signal **Алег Ларычаў** паведаміў у адной з суполак у мэсэнджэры Telegram, што быў затрыманы міліцыяй разам зь сяброўкай **Ганнай Новік**, пры іх былі фарбы і трафарэты. Пра затрыманне паведамляе Радыё Свабода.

Выходныя іх пратрымалі спачатку ў РУУСе Кастрычніцкага раёна, затым у ІЧУ на Акрэсціна.

Паводле допісу, Ларычава і Новік затрымалі ў суботу, 3 чэрвеня, а цяпер вязуць у суд Кастрычніцкага раёну Менску. На тэлефанаваньні ён не адказвае. У чым абвінавачваюць Ларычава, невядома.

Пазней стала вядомя, што іх спачатку даставілі ў Кастрычніцкі РУУС, а затым у суд. Ім пагражае пакаранне па арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства).

Суддзя **Сяргей Германовіч** прыняў рашэнне адкласці разгляд адміністратыўнай справы. Пра гэта ў сацыяльных сетках паведаміў блогер **Антон Матолька**. Суд пачаўся пасля 14 гадзін.

Як перадае з суду блогер **Раман Пратасевіч**, першай судзяць Ганну Новік. Паводле суду, Новік і Ларычаў «каля 2:40 ночы на вуліцы Магілёўскай гучна лаяліся матам, на заўвагі не рэагавалі». Іх затрымалі «людзі ў цывільным», закінулі ў мікрааўтобус. "Да нас звярнуліся ў грубай форме і пацягнулі у машыну", — распавёў на судзе Алег Ларычаў, які выступае на гэтым працэсе сведкам.

Сведка-амапавец патлумачыў суду, што двое нешта малявалі, аднак ён не бачыў што, але адзначыў, што яны гучна лаяліся і пагражалі супрацоўнікам міліцыі.

Ганну Новік за дробнае хуліганства суд пакараў штрафам у памеры **10 базавых велічынь**.

Адміністратыўную справу Алега Ларычава разглядае суддзя **Віталь Сямёнаў.** Ён абвесціў перапынак для прыняцця рашэнне, які ў выніку зацягнуўся. Рашэнне будзе агалошана заўтра. Да гэтага часу Алег Ларычаў вызвалены з-пад варты.

6 чэрвеня суд зачытаў рашэнне па адміністрацыйнай справе супраць Алега Ларычава, якім асудзіў маладога чалавека да штрафу ў памеры **30 базавых велічынь**.

Алег Ларычаў раней адсядзеў 5 сутак за нібыта «маханьне рукамі і нецэнзурную лаянку», да таго Ларычава аштрафавалі на 1150 рублёў за дамалёўку калючага дроту на мурале «Масква-Менск». Ларычаў кажа, што адчуў на Акрэсьціна «асаблівае стаўленьне», зьвязвае гэта з тым, што старонка ягонага праекту Signal паведамляла ў сацсетках пра палітычныя графіці і аплікацыі ў Менску (хто іх рабіў, невядома). На пачатку красавіка Ларычаў быў зьбіты двума невядомымі, нападнікаў дагэтуль не знайшлі.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY